**К.А. Зайцава**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
e-mail: katsyaryna_zaytzava@mail.ru

УДК 811.161.3’373.21(476.5)

# МІКРАТАПАНІМІЯ БЕШАНКОВІЧЧЫНЫ: НАМІНАЦЫЙНЫ АСПЕКТ

Ключавыя словы: *мікратапонім, онім, апелятыў, неафіцыйныя назвы, рэгіён, уласнае імя, Бешанковіцкі раён.*

*У артыкуле выяўляюцца асаблівасці функцыянавання неафіцыйных геаграфічных назваў Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. Вызначаюцца і характарызуюцца асноўныя групы мікратапонімаў.*

**E.A. Zaytseva**
Vitebsk State University named after P.M. Masherov

# MYCROTOPONYMY OF BESHENKOVICHY REGION: NOMINATIVE ASPECT

Key words: *mycrotoponym, onym, appellative, unofficial name, region, personal name, Beshenkovichy district.*

*In the article the peculiarities of denomination of the unofficial geographical names of the settlers in Beshenkovichy district of Vitebsk region. Discovered and the main groups of mycrotoponyms are determined and characterized.*

Даследаванне онімаў на сучасным этапе развіцця навукі носіць антрапацэнтрычны характар і адрозніваецца павышанай зацікаўленасцю да рэгіянальных даследаванняў (Т.Ю. Васільева, Н.І. Васілюк, У.М. Генкін, М.А. Дарошка, А.А. Іванова, І.Л. Капылоў, М.М. Карсакова, С.С. Клундук, А.А. Лукашанец, Н.М. Лявончык, Г.М. Мезенка, М.У. Міцкевіч, Н.Р. Якубук і інш.). Кожны рэгіён – своеасаблівая тэрыторыя са сваёй гісторыяй і традыцыямі. Сярод мясцовых жыхароў мікратапонімы не з’яўляюцца ў першую чаргу носьбітамі назваў, а служаць знакамі, меткамі дзеля адрознення геаграфічных аб’ектаў. У неафіцыйных назвах закладзены мадэлі ўспрыняцця людзьмі рэчаіснасці, яны ў сваёй большасці індывідуальныя і непаўторныя. *Мэта* працы – вызначыць асаблівасці намінацыі мікратапанімных адзінак Бешанковіччыны. На даследаванай тэрыторыі намі было зафіксавана 106 неафіцыйных найменняў. Намінацыі падлягаюць самыя розныя дэнататы: былыя вёскі, водныя аб’екты, вуліцы, выганы, горы, дарогі, месцы ў лесе, палі, сады, часткі населеных пунктаў. Пералічаныя аб’екты даволі разнастайныя па сваёй семантыцы і ўзыходзяць да антрапонімаў розных груп апелятыўнай лексікі. На аснове розных намінацыйных падстаў намі былі вылучаны наступныя групы мікратапонімаў: **1) мікратапонімы, якія паходзяць ад онімаў; 2) мікратапонімы, што ўзыходзяць да груп апелятыўнай лексікі; 3) мікратапонімы-арыенціры.**

Першую групу мікратапонімаў складаюць **найменні, якія паходзяць ад онімаў.** Пераважная большасць іх узыходзіць да **антрапонімаў**: *Архіпаў хутар, Кузьміхіна гара*. У дадзенай групе мы вылучылі наступныя падгрупы: **а)** мікратапонімы, якія паходзяць ад уласных асабовых імен: *Маркава* (месца ў лесе, звязанае з іменем Марк), *Міколкава магіла* (месца ў лесе, дзе падчас вайны загінуў салдат Мікола), *Міхалкін хутар* (узгорак у в. Дразды, былы хутар гаспадара Міхала), *Таццянін хутар, Фёдараў хутар* (0,5%);



Репозиторий ВГУ

**б)** мікратапонімы, утвораныя ад прозвішчаў: *Мураўскае балота* (былы хутар, дзе жыў гаспадар па прозвішчы *Мураўскі*), *Новікава гара* (узвышша ў в. Дразды, дзе гаспадарыў Новік), *На Пражаннікава* (месца ў лесе ў в. Шыпулі, дзе калісьці жыў пан Пражаннік), *Чарняхоўка* (мясцовая назва вуліцы Чарняхоўскага, названая ў гонар героя Савецкага Саюза І.Д. Чарняхоўскага); **в)** мікратапонімы, утвораныя ад мянушак. На даследаванай тэрыторыі намі быў зафіксаваны толькі адзін такі аб’ект: *Кузьміхіна гара* – месца ў лесе ў в. Быстры, дзе раней гаспадарыла жанчына па мянушцы *Кузьміха* (ад імені мужа Кузьма).

Другую групу складаюць найменні, якія паходзяць ад **тапонімаў.** У яе ўваходзяць назвы розных мікрааб’ектаў (гор, дарог, лясоў, садоў, палёў). Сярод дадзенай групы пераважаюць мікратапонімы, утвораныя ад: **а)** камонімаў: *Кашчаўскі выган* (месца выгану скаціны ў в. Кошчава), *Маладворскае возера* (возера, якое знаходзіцца ў в. Малы Двор), *Прамышлянскі сад* (сад паблізу в. Промыслы), *Саўчонская гара* (гара, што знаходзіцца ў в. Саўчонкі); **б)** урбанонімаў: *Маладзёжка* (мікрараён у г.п. Бешанковічы, што атрымаў назву ад вуліцы Маладзёжная).

На даследаванай тэрыторыі дамінуюць найменні, утвораныя ад назваў вёсак і ўласных асабовых імён. Гэта гаворыць аб тым, што галоўнай тэндэнцыяй іменавання аб’ектаў з’яўляецца іх месцаразмяшчэнне, прыналежнасць таму ці іншаму чалавеку.

Самай вялікай па колькасці адзінак з’яўляецца група **мікратапонімаў, што паходзяць ад апелятываў,** якія ў сваю чаргу: **1)** характарызуюць якасць мясцовасці: *Вясёлы хутар* (былое месца збору моладзі), *Гарэлае балота* (балота, якое раней гарэла), *Кароўская нага* (лясная паляна, падобная па форме на нагу каровы), *Касая гара* (нябачны ўклон дарогі, дзе часта здараюцца аварыі), *Мядзвежы роў* (страшнае месца ў лесе, куды ўсе людзі баяцца хадзіць), *Обшчая сажалка* (якой карыстаюцца ўсе жыхары вёскі), *Цёмны мох* (месца ў лесе, дзе расце густы мох), *Чорны ручай* (глыбокі вадаём з чорнай вадой, які немагчыма перайсці); **2)** характарызуюць людзей па сацыяльным стане, званню, нацыянальнасці: *Беларусы* (частка в. Кошчава, дзе раней жылі беларусы), *Маскалі* (частка в. Кошчава, дзе раней жылі толькі маскалі), *Панскае поле* (поле ў в. Буй, былы хутар пана); **3)** паўтараюць назву былога аб’екта: *Кірпічны* (поле, на якім раней быў кірпічны завод), *Магніт* (месца ў парку ў в. Бачэйкава, былая альтанка для збору моладзі. “Усіх туды цягне, як магнітам” – так кажуць мясцовыя жыхары пра гэтае месца), *МСО* (мікрараён ў г.п. Бешанковічы, што знаходзіцца побач з былой арганізацыяй – Межрайонное строительное объединение); **4)** змяшчаюць царкоўную лексіку: *Святы ручай* (ручай, які асвяціў святар), *Царкавішча* (узгорак, дзе раней дзейнічала царква), *Царкоўная вуліца* (вуліца, на якой знаходзіцца царква); **5)** называюць аб’ект, што знаходзіцца побач: *Бальнічка* (вадаём для купання, які знаходзіцца побач з лячэбнай установай г.п. Бешанковічы), *Кладбішчанскі выган* (выган для скаціны, які размешчаны побач з вясковымі могілкамі), *Магазінная сажалка* (вадаём размешчаны за 50 метраў ад вясковага магазіна); **6)** падкрэсліваюць асаблівасці наменклатурнага характару: *Гарадок* (частка в. Дразды); **7)** характарызуюць аб’ект па: асаблівасцях рэльефу: *Дарога на Гару, Горкі* (частка в. Астроўна), *Касая Гара;* па канфігурацыі геаграфічнага аб’екта: *Астравы* (месца на балоце), *Лінія* (мяжа паміж населеным пунктам і лесам), *Круглае балота, Пятачок* (месца пасярэдзіне вёскі для збору сялян у в. Дразды), *Смалянскі пятачок* (месца збору моладзі ў лесе); па памерах і часе ўзнікнення: *Бальшы Коўш* (Вялікая Мядзведзіца), *Малы Коўш* (Малая Мядзведзіца), *Старадарожжа* (накірунак дарогі); **8)** змяшчаюць фларыстычную і фаўністычную лексіку: *Барок, Бярэзнік, Дрэўкі* (месца ў лесе), *Лозы* (кусты, дзе расце лаза), *Мох* (месца ў лесе, дзе расце шмат імху), *На Дубок* (дуб, які расце ў лесе); *Кароўская нага, Козьі горы, Лісьі норы, Мядзвежы роў.*

Паводле колькаснага складу **мікратапонімы-арыенціры** найменш пашыраны ў мікратапанімнай сістэме Бешанковіччыны. З іх дапамогай менш вядомыя мікрааб’екты

абазначаюцца праз больш вядомыя: *Дарога на Гару* (гара – частка н.п. Бачэйкава), *Зарэчча* (частка н.п., якая знаходзіцца за ракой), *На Вадзе* (альтанка, пабудаваная на беразе сажалкі, месца адпачынку моладзі). А.І. Яшчанка лічыць увогуле неправамерным адносіць назвы-арыенціры, якія стасуюцца з прыназоўнікава-іменнымі спалучэннямі, да групы мікратапонімаў. На думку даследчыка, такія назвы не належаць да лексічнага ўзроўню мовы, не выконваюць намінацыйнай функцыі і выступаюць у маўленні як няпоўныя эліптычныя сказы [2, 22].

Такім чынам, семантыка мікратапанімічных назваў яскрава адлюстроўвае светабачанне людзей, характар успрыняцця рэчаіснасці. Асноўнымі паказчыкамі пры намінацыі з'яўляюцца прыналежнасць аб'екта канкрэтнаму чалавеку, форма, якасць. Сярод такіх прыкмет на першае месца выходзяць характарыстыка формы аб'екта, флора і фаўна рэгіёна. Мікратапанімія ўзнікае на базе дыялектных форм мовы і мае сферу функцыянавання, абмежаваную тэрыторыяй распаўсюджання дадзенай гаворкі.

**Літаратура**

1. Мезенко, А. М. Белорусская ономастика. Топонимия : учеб. пособие / А. М. Мезенко [и др.]; под общ. ред. А. М. Мезенко – Минск : Элайда, 2012. – 260 с.
2. Ященко, А. И. Лингвистический анализ микротопонимов определенного региона : курс лекций / А. И. Ященко. – Вологда, 1977. – С. 22.

**А.В. Кавалёва**
Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна
e-mail: alena.kavaliova@gmx.de

УДК 811.161.3'373.21(476)

## МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ ПЕРАЙМЕНАВАННІ ПААЗЕР'Я XX СТАГОДДЗЯ

Ключавыя словы: *перайменаванне, айканімія, мемарыяльны айконім, апелятыў, антрапонім, тапаасноўа*.

*У артыкуле вызначаюцца мемарыяльныя адзінкі Паазер'я, утвораныя пераважна ад прозвішчаў герояў Вялікай Айчыннай вайны. Разглядаюцца назвы населеных пунктаў, якія былі страчаны, аналізуюцца іх утваральныя асновы. Выяўлена, што гэтыя зніклыя айконімы фіксуюць старажытны антрапанімікон, утрымліваюць назвы гістарычных форм землеўладання, паходзяць ад геаграфічных тэрмінаў, што характарызавалі пэўную мясцовасць.*

**A.V. Kavaliova**
Mozyr State Pedagogical University named after I.P. Shamyakin

## THE COMMEMORATIVE PAAZERYE REGION OIKONYMS IN THE XXth CENTURY

Key words: *denomination, oikonymy, commemorative oikonym, appellative, anthroponym, toponymic stem.*

*The article deals with the commemorative oikonyms in Paazerye region, which are mainly based on the surnames of Great Patriotic War heroes. The oikonyms, which were lost because of denomination, are defined, their toponymic stems are analyzed. It is revealed, that the lost oikonyms register the historical anthoponymicon, they contain the notions of the*



Репозиторий ВГУ